**Паштальён**

Жыў-быў на свеце паштальён. Ён вельмі любіў сваю прафесію, лічыў яе самай лепшай і карыснай, бо кожную раніцу ён прыносіў людзям цікавыя газеты і часопісы, а таксама лісты. Больш за ўсё паштальён любіў уручаць каму-небудзь доўгачаканыя лісты і віншавальныя паштоўкі, бо яны прыносілі чалавеку радасць. Аднак з кожным днём паштовак і лістоў станавілася ўсё менш. Людзі пераставалі пісаць адзін аднаму лісты і дасылаць паштоўкі. Пачалі больш перапісвацца па электроннай пошце. Гэта вельмі клапаціла паштальёна.

Была ў гэтага чалавека запаветная мара: ён хацеў на машыне часу трапіць у будучыню, каб паглядзець, як жывуць людзі, чым яны цікавяцца. Аднак ажыццявіць сваю мару ніяк не мог. І вось ён вырашыў уявіць сябе лістом і напісаць пасланне сваім нашчадкам у далёкую будучыню:

“Вітаю вас, мае паважаныя сябры! Не ведаю, у якім годзе я апынуўся, у які час адзін з вас трымае мяне ў руках і чытае сваім сябрам, а, мабыць, бацькам ці настаўнікам.

Я – ліст з далёкага 2021 года. Мабыць, у ваш час, у які я трапіў, ужо не пішуць лісты на паперы, мабыць, іх ужо выцеснілі электронныя лісты, паведамленні, перапіска праз інтэрнэт ці штосьці іншае. Тэхніка ідзе ў нагу з жыццём. На жаль, нават у нашым, 2021 годзе, лісты на паперы сталі зусім нямоднымі, іх амаль ніхто ўжо не піша. Іх замянілі лісты па электроннай пошце, паведамленні, нават віншаванні, якія людзі адсылаюць адзін аднаму па інтэрнэце.

Тэхніка крочыць наперад. Трэба табе адаслаць ліст ці паведамленне камусьці ў іншы горад – напісаў па электроннай пошце, і чалавек праз дзве-тры хвіліны атрымлівае тваё паведамленне. Гэта вельмі зручна!

Аднак электронная пошта больш падыходзіць для афіцыйнай перапіскі, для вырашэння пэўных спраў. А каб павіншаваць дарагога табе чалавека, лепш зрабіць гэта не па электроннай пошце, а адаслаць яму звычайную паштоўку па пошце.

Звычайны ліст ці паштоўка, напісаныя ад рукі, захоўваюць у сабе столькі цеплыні, пяшчоты, клопату, рамантыкі! На звычайнай паштоўцы ты пішаш словы віншавання, якія адрасаваны менавіта гэтаму чалавеку. Гэтая простая паштоўка, напісаная ад рукі, значыць вельмі шмат: яна дае зразумець чалавеку, якому адрасавана, што пра яго памятаюць, яго цэняць і паважаюць, што напісана гэтая паштоўка і адрасавана менавіта яму. А па электроннай пошце можна адзначыць значком усіх сваіх сяброў, знаёмых і адаслаць ім аднолькавае віншаванне. Вельмі часта чалавек робіць гэта аўтаматычна, нават сам не памятае, каго павіншаваў. І віншаванне прыходзіць усім аднолькавае, як

бы “дзеля галачкі”, каб не пакрыўдзіліся. І радасці такой  гэтае віншаванне не выклікае, як звычайная паштоўка, прысланая менавіта табе!

Кавалачак паперы, на якім напісаны словы ад дарагога табе чалавека яго рукой: маці, бацькі, брата, сястры, сына, дачкі, каханага ці сябра, грэе сэрца і душу. Здавалася б, кавалачак паперы з напісанымі менавіта для цябе словамі, а колькі цеплыні і шчасця дорыць ён адрасату і адрасанту!

Сябры! Пішыце адзін аднаму звычайныя лісты, адпраўляйце паштоўкі па пошце – гэта так рамантычна і прыемна! Нават сэрца ў грудзях пачынае біцца па-іншаму, калі да Вас прыходзіць паштальён і ўручае ліст ці паштоўку ад дарагога чалавека. Пішыце адзін аднаму лісты: я не хачу паміраць, я хачу жыць вечна, хачу дарыць людзям радасць!

Колькі б гадоў ні мінула – камп’ютар не можа і не павінен замяніць душэўныя чалавечыя зносіны”.

***Воднева Аліна Аляксееўна,***
вучаніца VI класа ДУА «Сярэдняя школа № 17
г. Магілёва»